УДК 351.855.3”19”:130.2

***У.П. Люкевіч***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін і методык іх выкладання*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: lucul@brsu.brest.by

# СТАНАЎЛЕННЕ НОВЫХ ТЭАРЭТЫКА-КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ НАПРАМКАЎ У ДАСЛЕДАВАННЯХ СПОРТУ Ў КАНЦЫ ХХ СТАГОДДЗЯ

*Новыя тэарэтыка-культуралагічныя напрамкі ў даследаваннях спорту ў канцы XX ст. сталі вынікам інтэнсіўнага развіцця навуковых ведаў з аднаго боку і імклівага пранікнення феномена спорту ў іншыя сферы чалавечай дзейнасці з другога. У спалучэнні з дамінантнымі навуковымі накірункамі, якія існавалі раней, спартыўны складнік зрабіўся важнай часткай спецыфічнага іх адгалінавання. Былі створаны адмысловыя вобласці ў даследаваннях спорту, якія ў далейшым паўплывалі на практыку гэтага віду сацыяльнай актыўнасці. Спартыўная інфармацыя, спартыўная палітыка, спартыўная эканоміка, спартыўная юрыспрудэнцыя, новыя распрацоўкі ў адносінах да спартыўнага абсталявання і інвентару шмат у чым садзейнічалі працэсу станаўлення спартыўнай інфраструктуры. Кантакты паміж названымі элементамі спрыялі ўзнікненню якасна новых фактаў і фактараў спорту.*

## Уводзіны

Пасля абрання ў 1980 г. на пост прэзідэнта Міжнароднага алімпійскага камітэта іспанскага маркіза Хуана Антоніа Самаранча імкліва пачалі адбывацца канцэптуальныя змены ў функцыянаванні гэтай уплывовай надурадавай арганізацыі. Зразумела, што такое становішча не магло не адбіцца на сістэме навуковых даследаванняў у галіне спорту. Апошнія дваццаць гадоў мінулага стагоддзя выявілі той факт, што менавіта ў гэты перыяд стала праяўляцца зацікаўленасць у даследаваннях новых накірункаў развіцця дадзенага феномену, што выявілася ў больш шырокім ахопе тэарэтычных аспектаў. Такая выснова пацвярджалася тым, што значэнне спорту як грамадскай з’явы пастаянна расце, і менавіта гэта падаецца фактарам, які характарызуе важныя сацыяльныя працэсы ў нашым грамадстве. Такім чынам, усё больш аспектаў чалавечага жыцця становяцца звязаны са спортам.

У дадзеным выпадку пашыраецца тэарэтычнае поле навуковых ведаў на падставе сінтэтычнага падыходу з улікам вызначэння розных аспектаў спалучэння спорту з іншымі сацыяльнымі з’явамі. У прыватнасці, у новы даследніцкі блок уваходзяць такія напрамкі, якія далей атрымліваюць адпаведнае абгрунтаванне і трывала замацоўваюцца ў сацыяльнай рэчаіснасці: навуковая інфармацыя і спорт як спартыўная інфармацыя; палітыка і спорт як палітыка спорту; юрыспрудэнцыя і спорт як спартыўная юрыспрудэнцыя; тэхнічныя навукі і спорт як тэорыя спартыўнага абсталявання і інвентару; эканоміка і спорт як эканоміка спорту. Усе гэтыя пяць тэарэтычных абласцей цесна звязаны з іншымі накірункамі функцыянавання навукі аб спорце: спартыўная медыцына, спартыўная біямеханіка, псіхалогія спорту, педагогіка спорту, сацыялогія спорту, гісторыя спорту і філасофія спорту. Можна таксама дадаць, што ў сувязі са сваёй тэрміналагічнай вызначанасцю тэорыя руху, тэорыя гульні, тэорыя трэнінгу і тэорыя навучання маюць быць канстатаваны як такія накірункі, што выкарыстоўваюцца дзеля таго, каб падкрэсліць кантэкст яшчэ іншых чатырох адметных прадметных абласцей у спартыўнай навуцы. Усе яны моцна звязаны з «дамінантнай» навукай, у прадметным полі якой адбываецца іх функцыянаванне і развіццё з улікам спецыфікі спорту.

Менавіта ў гэтым рэчышчы ў канцы мінулага стагоддзя істотна ўзрасло значэнне спартыўнай інфармацыі ў сістэме агульнай навуковай інфармацыі, колькасць якой бесперапынна павялічваецца, а змест становіцца ўсё больш важным. Тое ж самае датычыцца палітыкі спорту: у агульным палітычным вымярэнні яна вызначае становішча спорту

як грамадскай з'явы, што праяўляецца шмат якімі аспектамі ў сацыяльнай рэчаіснасці. Спартыўная юрыспрудэнцыя дэманструе пашырэнне адміністравання і бюракратызацыі ў спосабах рэалізацыі спартыўнай дзейнасці. Спартыўнае абсталяванне і інвентар з'яўляюцца неад'емнай часткай дойлідства і інжынернай думкі, хоць часам, праўда, яны ігнаруюцца. Нарэшце, эканоміка спорту ў сувязі з сучаснай эканомікай сённяшняга дня набывае статус новай ідэалогіі спорту.

**Новыя тэарэтыка-культуралагічныя напрамкі ў даследаваннях пра спорт**

Навука ў цэлым і спартыўная навука ў прыватнасці дынамічна развіваецца. Таму вельмі верагодна, што асобныя тэарэтычныя галіны ў бліжэйшай альбо больш аддаленай перспектыве дасягнуць такога ўзроўню, што могуць паўстаць у якасці адпаведных тэарэтычных мадэляў. Іншымі словамі, гнуткая і дынамічная мадэль для апісання аспектаў спартыўнай навукі з арыентацыяй на тэарэтычныя палі альбо тыя дысцыпліны, якія развіваюцца, з'яўляецца неабходнай у гэтым вывучэнні.

*Спорт і навуковая інфармацыя.* Спорт з'яўляецца часткай грамадскага жыцця і рэалізуецца ў шматлікіх формах. Ён пранікае як важная частка інфармацыйнай сістэмы далей у палітыку, эканоміку і культуру. Гэтаму ёсць доказы ў розных публікацыях у сродках масавай інфармацыі. Спорт як частка чалавечага жыцця пастаянна прадукуе інфармацыю, якая перадаецца іншым і дакументуецца. Спорт з поўным правам можа разглядацца як генератар інфармацыі. Спартыўная інфармацыя, або спалучэнне навуковай інфармацыі са спортам, з'яўляецца, з аднаго боку, дадатковай часткай навуковай інфармацыі, а з другога – паўстае як тэарэтычная вобласць спартыўнай навукі. Спартыўная інфармацыя як тэарэтычнае поле развіваецца ў апошнія гады даволі імкліва дзякуючы велізарнай колькасці разнастайных фактаў пра спорт па самых розных накірунках. Працэсы атрымання, пераказвання і адваротнай сувязі інфармацыі патрабуюць, каб стратэгіі і мадэлі навуковай інфармацыі былі прыстасаваны да спорту. Гэтая задача дасягаецца праз спартыўную навуковую інфармацыю. Службовая рэгламентацыя (загады, палажэнні, пастановы і г.д.) у гэтым працэсе адыгрывае даволі важную ролю, калі прымаць да ўвагі розныя вымярэнні ў банку такіх дадзеных, як дакументы, літаратура, аўдыёвізуальныя матэрыялы. Навуковая інфармацыя сама з'яўляецца прыкладам інтэгратыўных навуковых ведаў, якія складаюцца з традыцыйных навук: лінгвістыкі, палітыкі, псіхалогіі, сацыялогіі і тэхналогіі. Названыя аспекты выяўляюцца менавіта тымі, хто мае дачыненне да спартыўнай навуковай інфармацыі, патрабуюць высокай ступені інтэграцыі мыслення.

У адпаведнасці з В. Кнэйерам [5, s. 126–137], да аспектаў спартыўнай інфармацыі можна залічыць шэраг складнікаў: лінгвістычны, палітычны, псіхалагічны, сацыялагічны, тэхналагічны і нарматыўны. Аднак Н. Шміц [9, s. 108–109] вызначае дакументацыю як асноўны тэрмін для інфармацыі і абгрунтоўвае свой пункт гледжання: гэта структураваны збор дадзеных і дакументаў усіх відаў, аналіз зместу і апрацоўка паводле сістэматызацыі, класіфікацыі, селекцыі, аналізу і напісання заключэння. Дакументацыя абслугоўвае хуткае і поўнае інфармаванне па адпаведных тэмах, накірунках ці навуковых праблемах. Гэта можа быць дакументацыя першасная (арыгінальныя дакументы) і другасная (бібліяграфія). Важным тут падаецца таксама і ранжыраванне дакументацыі. Віды дакументацыі (апісанне, узнаўленне, класіфікацыя) і неабходныя спецыяльныя веды па сістэматызацыі яе ствараюць своё навуковае поле. У сістэме спартыўнай дзейнасці інфармацыйнае забеспячэнне набывае ўсё больш важнае значэнне, каб дасягнуць адпаведнага ўзроўню ў трэніровачным працэссе, а ў канчатковым выніку мець поспехі ў спаборніцтвах.

*Спорт і палітыка.* Спорт з'яўляецца субсістэмай грамадства, якая цесна звязана са стратэгіяй палітычнай логікі. З аднаго боку, спорт абумоўлены палітыкай адносна

сваіх магчымасцей, а з другога – спорт з'яўляецца таксама інструментам палітыкі, і існуе небяспека выкарыстання яго дзеля палітычных мэтаў у якасці ідэалогіі.

Палітыка спорту як тэрмін абазначае кожную спартыўна арыентаваную публічную акцыю як індывідаў, так і грамадскіх інстытутаў. Спартыўныя дзеянні рэалізуюцца на ўзроўні спорту як сацыяльнай сілы з адноснай незалежнасцю, а таксама і на ўзроўні дзяржавы як інстытута, які прадстаўляе арганізаванае жыццё чалавецтва. Абодва полюсы – спорт і палітыка – часамі здаюцца абсалютнымі. Магчымасці для функцыянавання палітыкі спорта на прасторы паміж гэтымі двума полюсамі з'яўляюцца, на жаль, вельмі часта непрызнанымі. Неабходны разумна арыентаваныя дзеянні палітыкі спорту ў такім накірунку як, напрыклад, спартыўнае злоўжыванне (празмерна павялічаныя амбіцыі дзяржавы пабудаваць вялікія спартыўныя аб'екты; ігнараванне праблем, звязаных з захаваннем навакольнага асяроддзя) альбо калі палітыка злоўжывае спортам (байкот Алімпійскіх гульняў; спорт як сродак нацыяналістычных дэманстрацый). Унутраныя і знешнія дзеянні з'яўляюцца прычынай палітыкі спорта. У прыватнасці, у Беларусі спорт пераважна паўстае як важнейшы механізм дзяржаўнай палітыкі, асабліва калі справа датычыцца прадстаўніцтва на міжнароднай арэне і стварэння знешне прывабнага іміджу краіны.

Тэрмін «палітыка спорту» вызначаецца як тэарэтычнае і навуковае паняцце і ўключае ў сябе ўсе праблемы палітыкі спорту. Гэта мае самае непасрэднае дачыненне да тэарэтычнага поля «палітыка спорту» (паліталогія спорту) – спартыўнай навукі ў цесным супрацоўніцтве з сацыялогіяй спорту.

Паводле С. Гюльдэнпфенніга [3, s. 138–159], элементамі ведаў палітыкі спорту з'яўляюцца: часткі спартыўнай сістэмы; інстытуты і арганізацыі спартыўнай сістэмы; людзі, адказныя за дзейнасць спартыўнай сістэмы; спартыўна-палітычныя акцыі; грамадскія інтарэсы ў спартыўнай сістэме; планы і праграмы адносна спартыўнай палітыкі; спартыўна-палітычныя падзеі; спартыўна-палітычныя ідэі і спартыўная палітыка як сацыяльная палітыка; спартыўная палітыка як форма палітычнай культуры; спартыўная палітыка як адукацыйная палітыка; уплывы палітыкі спорту на спорт і сацыяльную сістэму.

Х. Блос [2, с. 352–353] падыходзіць да гэтага пытання з іншага боку і вызначае палітыку спорту праз дзве супрацьлеглыя пазіцыі – «спорт як абазначэнне палітыкі» і «спорт як палітычна вольнае месца», якія павінны падлягаць акцэптацыі. Далей адносіны спорту і палітыкі могуць быць прадстаўлены ў двух варыянтах.

1. Палітыка спорту плануе і вырашае пытанні адносна ўнутранай і знешняй палітыкі, якая мае дычыненне да спорту ў больш шырокім сэнсе. Гэтыя дзеянні на дзяржаўным і лакальным узроўні (публічная спартыўная адміністрацыя) і на ўзроўні сацыяльных груп і інстытутаў (самаадміністрацыя ў спорце) уключаюць ў сябе задачы, прызначэнні і мэты так званага свабоднага, арганізаванага і інстытуцыяналізаванага спорту. Спорт, такім чынам, арыентуецца на паспяховае развіццё, што забяспечваецца палітыкай. Спорт не паўстае ў якасці аўтаноміі і не дзейнічае незалежна ад усяго свету. У пэўнай ступені спорт залежыць ад палітыкі і наадварот.

2. Палітыка спорту ў больш вузкім сэнсе абазначае тэарэтычнае поле спартыўнай навукі, што часам выглядае як частка сацыялогіі спорту. Але паліталогія спорту выяўляе такія погляды, што рэалізуюцца ў межах гэтай навуковай дысцыпліны: спорт і сацыяльная палітыка; спорт і палітычныя партыі; спорт і сацыяльныя ўстановы; спорт і знешняя палітыка ва ўсім свеце.

Спорт і палітыка ў сістэме грамадскіх сувязяў пераплятаюцца ва ўсё больш цесных і моцных кантактах, прычым гэтае ўзаемадзеянне з цягам часу стала развівацца дынамічна і інтэнсіўна на розных узроўнях функцыянавання кожнай з вызначаных аблас-

цей. Пачатак бягучага стагоддзя яскрава дэманструе, як паміж імі адбываецца працэс кантактаў і якія высновы робяцца па выніках такога часам супярэчлівага сінтэзу.

*Спорт і юрыспрудэнцыя.* Спорт з'яўляецца часткай жыцця грамадства, якое характарызуецца ўзрастаннем уплыву права і рэгуляцыі залежнасці на ўзроўні быцця пэўнай арганізацыі паводле самых разнастайных крытэрыяў. Ступень рэгуляцыі ў прафесійным спорце надзвычай высокая, і гэта залежыць перш за ўсё ад тых фінансавых і іншых інвестыцый, якія ёсць у гэтай сістэме сацыяльнай дзейнасці. Падобнага роду рэгуляцыя мае тэндэнцыю да памяншэння свайго ўплыву на ўзроўні федэральных адукацыйных інстытутаў, спартыўных клубаў, камерцыйнага спорту ці неінстытуцыязаванага спорту. Але па вялікім рахунку спорт як субсістэма грамадства ўсё больш і больш характарызуецца адпаведнымі законамі і правіламі на кожным з пералічаных узроўняў.

Адносна аспектаў спартыўнага права могуць быць вызначаны дзве формы, якія яўна дэманструюць сутнасць тых падыходаў, што сфармаваліся раней гістарычна, а таксама тых, што ўзніклі пад уплывам патрабаванняў сённяшняга часу.

1. Самаадміністраванне спорту, што характарызуецца сваёй асабістай сістэмай правілаў, асабліва тых, якія адносяцца да спартыўных клубаў і спартыўных асацыяцый: напрыклад, дзеля падтрымкі адпаведных законаў існуюць спецыяльныя недзяржаўныя прававыя суды.

2. Спартыўнае права можа разглядацца як сукупнасць законаў, якія могуць быць прыменены ў спорце. Гэта з'яўляецца асабліва важным для прававых сектараў, якія часткова адносяцца да публічнага спартыўнага адміністравання.

Правілы і законы маюць дачыненне да тых спартыўных дысцыплін, якія датычацца публічнай улады. Напрыклад: паветраныя віды спорту (права на паветраны рух); водныя віды спорту (права на рух па вадзе); зімнія віды спорту (закон аб ахове навакольнага асяроддзя); школьны спорт (школьныя правілы); абавязковасць закона регуляваць легальную адказнасць паміж спартыўным клубам і яго членамі; кампанія і яе працаўнікі ў індустрыі спорту; арганізатары спартыўных спаборніцтваў, спартсмены і гледачы. Спартыўнае права імкліва павышае сваё значэнне. Ліцэнзаванне трэнерскай дзейнасці і фармаванне сеткі спартыўных агентаў і менэджэраў напрыканцы XX ст. стала звычайнай справай. Спорт распаўсюджваецца па ўсё большых абшарах, адпаведна ўсё большай становіцца роля адміністравання і бюракратыі, і да таго ж павялічваецца эканамічны ўплыў на адпаведную вобласць спорту.

Э. Рэшке лічыць, што можна вызначыць тыя складнікі, што характарызуюць веды спартыўнай юрыспрудэнцыі: законы, якія адносяцца да клубаў, асацыяцый, кантрактаў, абавязацельстваў, страхавання, працы і грамадскіх спраў, а таксама да адпаведнага рэгіёну краіны, дзяржавы ў цэлым у адпаведнасці з асаблівасцямі адміністравання, падаткаў, крымінальных актаў, правіл Еўрапейскай супольнасці і інш. [6, с. 160–173]. Э. Рэшке надае пільную ўвагу прававому рэгуляванню спартыўнай дзейнасці і абгрунтоўвае юрыспрудэнцыю спорту наступным чынам. Калі людзі займаюцца падобным відам дзейнасці разам, то неабходна мець правілы, прыняцце якіх мае сілу для гульні ці параўнання выступлення. Функцыі рэферы і юрыста засноўваюцца на адпаведных законах, таму што гэтыя асобы сочаць за выкананнем правіл і выдаюць санкцыі, калі правілы парушаюцца; іх дзеянні павінны быць зразумелымі і адпаведна абазначанымі. Існуе патрэба паставіць у нязручнае становішча атлета альбо каманду, якія парушаюць правілы. Для гэтага ствараюцца абавязковыя арганізацыйныя перадумовы, напрыклад права гуляць і ўдзельнічаць, абавязкі і правы ўдзельнікаў ці членаў каманды альбо клуба, што павінна быць зафіксавана ў кантрактах. Асноўнае патрабаванне спартыўнага права заключаецца ў выкананні гэтых правіл, у іх інтэрпрэтацыі, прымяненні і ацэньванні норм адносна юрыдычнага права ў спорце. Але таксама абавязкова павінны ўлічвацца іх адносіны да ўсеагульнага права [6, с. 160–161].

Спартыўная юрыспрудэнцыя ў больш вузкім сэнсе адносіцца да сістэмы норм у спорце. Гэта абазначае статус, парадак і рэгуляцыю адносін паміж клубамі і асацыяцыямі, якія займаюцца арганізацыяй спартыўнай дзейнасці. Напрыклад, свабоднае развіццё асобы і ўключэнне права на адпачынак і заняткі спортам гарантаваны Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і Законам аб фізічнай культуры і спорце. Калі гэтыя правы асобы альбо іншыя правы чалавека парушаюцца, могуць узнікнуць пэўныя пытанні пра абавязковасць выканання заканадаўчых норм для атлетаў і спартыўных арганізацый. З другога боку, магчыма, што атлеты і спартыўныя арганізацыі маюць розныя пытанні да сваіх канкурэнтаў, якія таксама павінны вырашацца ў прававым полі. Спорт усё больш паўстае як феномен адносна шмат якіх частак грамадства. Але больш за ўсё пытанняў узнікае да «спорту для ўсіх», якія падымаюцца спартыўнымі арганізацыямі. Гэта адбываецца з-за таго, што ён рэгулюецца больш агульнымі законамі, якія распаўсюджваюцца таксама на спартыўнае відовішча. Адначасова з гэтымі законамі дзейнічаюць спецыяльныя правілы, якія рэгулююць адносіны паміж спортам і правам, юрысдыкцыяй і навукай права, што дзейнічаюць ў святле сувязяў паміж спортам і правам у шырокім сэнсе.

*Спорт і эканоміка.* Спорт з'яўляецца такой сацыяльнай вобласцю, якая, з аднаго боку, моцна абумоўлена эканомікай, а з другога – падаецца важным эканамічным фактарам сваіх актыўных і пасіўных формаў спартыўнай рэчаіснасці. Спорт сам зрабіўся эканомікай паводле новай ідэалогіі. Эканоміка спорту, ці спартыўная эканоміка, – гэта дадатковая субдысцыпліна эканамічных навук і тэарэтычная вобласць спартыўнай навукі, якая даследуе адносіны паміж спортам і эканомікай. Камерцыялізацыя і прафесіяналізацыя спорту пастаянна ўзрастае, што найбольш заўважана ў наступных накірунках.

1. Прадметна-арыентаваная падтрымка эканомікай спорту: экіпіроўка атлетаў (спартыўная форма, абутак, апаратура) і пабудова спартыўных аб'ектаў.

2. Персанальна арыентаваныя паслугі, такія як адміністраванне ў спартыўных клубах, фітнэс-цэнтрах, спартыўных школах; праграмы спартыўнай актыўнасці, якія прапануюцца турыстычнай індустрыяй; арганізацыя спартыўных спаборніцтваў для прыхільнікаў спорту.

Эканоміка і бізнес як сучасная ідэалогія спорту. Гэта абазначае, што спорт выкарыстоўваецца для розных мэтаў эканамічнай сістэмы. Разам з тым спорт з таго часу, як ён скааперваўся са светам бізнесу, павінен асцерагацца разнастайных фінансавых скандалаў. Такім чынам, тэарэтычнае поле спартыўнай эканомікі мае справу яшчэ і з пытаннямі, якія аналізуюцца на сацыялагічным і філасофскім узроўнях.

К. Хайнэман перакананы, што для апісання асноў у эканоміцы спорту шэраг пералічаных ніжэй фактараў з'яўляюцца прыкладамі для аналізу ў дадзенай сферы: мікраэканамічная тэматыка (напрыклад, эканамічныя мэты спартыўных праграм, якія вызначаюцца ў камерцыялізаваных прадстаўленнях); мезаэканамічная тэматыка (напрыклад, эканоміка камерцыялізацыі); макраэканамічная тэматыка (напрыклад, спартыўная і эканамічная сістэма) [4, с. 184–185].

На думку Х. Блоса, спартыўная эканоміка мае справу з усімі тымі пытаннямі, якія адносяцца да спорту і эканомікі [2, с. 351]. На сёння гэтыя адносіны даследаваны толькі ў невялікай ступені. Спорт робіцца галоўным эканамічным фактарам у сучасных індустрыялізаваных дзяржавах. Мільярды долараў укладзены ў вытворчасць спартыўнай экіпіроўкі і спартыўнага адзення. У гандлі спартыўнай формай, у пабудове спартыўных аб'ектаў, у рэкламнай індустрыі і ў прафесійным спорце яскрава падкрэсліваецца эканамічны бок. Усё гэта стварае сістэму нацыянальных і інтэрнацыянальных адносін у сферы эканомікі спорту як для асобнай краіны, так і для ўсяго свету бізнесу.

Эканоміка спорту развіваецца па двух наступных галоўных лініях. З аднаго боку, навукова-тэхнічныя вынаходніцтвы спартыўнага інвентара робяць магчымым павя-

лічыць прапанаваныя рэкрэацыйныя праграмы дзейнасці і прадукаваць надзвычайныя поспехі ў выступленнях атлетаў на вышэйшым узроўні. З другога боку, статус так званага спартсмена-аматара падпадае пад пагрозу ў сувязі з уплывам і ціскам, якія зыходзяць ад эканамічных інстытутаў. Разам з тым правядзенне буйных спартыўных спаборніцтваў з фінансавага пункту гледжання становіцца вельмі прыбытковай справай. Асабліва гэта відна на прыкладзе тых краін, якія маюць развітую спартыўную індустрыю, сучасныя спартыўныя аб’екты, вызначаюцца добра распрацаванай сістэмай лагістыкі. Пра гэта сведчаць турніры па розных відах спорту на тэрыторыі Еўропы, у прыватнасці чэмпіянат Еўропы па футболе. Калі прасачыць, як выглядае дынаміка даходаў арганізатараў чэмпіянатаў Еўропы па футболе за апошнія дваццаць чатыры гады, то гэта можа быць зафіксавана наступным чынам (табліца).

Табліца. – Даходы арганізатараў чэмпіянатаў Еўропы па футболе, млн еўра [1, с. 226]

| Год | Краіна правядзення | Колькасць удзельнікаў | Даход |
|---|---|---|---|
| 1992 | Швецыя | 8 | 40,9 |
| 1996 | Англія | 16 | 147,3 |
| 2000 | Бельгія і Галандыя | 16 | 229,9 |
| 2004 | Партугалія | 16 | 855,2 |
| 2008 | Аўстрыя і Швейцарыя | 16 | 1 350,9 |
| 2012 | Польшча і Украіна | 16 | 1 390,9 |
| 2016 | Францыя | 24 | 1 930,0 |

*Спартыўная індустрыя.* Спорт з’яўляецца формай чалавечага руху і паводзін, якія залежаць звычайна ад абсталявання і экіпіроўкі. Гэтая залежнасць мае крэатыўны бок у адносінах да новых ліній развіцця спартыўнага абсталявання і спартыўнай экіпіроўкі, што, у сваю чаргу, уплывае на развіццё новых тэхнічных і тактычных уменняў і ўвогуле новых спартыўных ведаў (напрыклад, дэльтапланерызм, сноўбордынг). Павелічэнне колькасці спартыўных дысцыплін, урэшце, з’яўляецца таксама вынікам развіцця адпаведнага інвентара. Такім чынам, існуюць узаемныя адносіны паміж спортам і спартыўным абсталяваннем і экіпіроўкай.

Тэма спартыўнага абсталявання і экіпіроўкі патрабуе ўвагі па некалькіх аспектах. Заняткі спортам патрабуюць наяўнасці разнастайнага рэквізіта. Спартыўная форма і спартыўныя дысцыпліны катэгарыязаваны ў адпаведнасці з наступнымі крытэрыямі: практыка спорту з адпаведнай апаратурай альбо без яе; летнія віды спорту – зімовыя віды спорту; водныя віды спорту – паветраныя віды спорту; спаборніцтвы ў памяшканні (пад дахам) – спаборніцтвы на паветры і г.д. Тэорыя спартыўнага абсталявання і экіпіроўкі ўключае ў сябе ўсе аспекты развіцця, вытворчасці, выкарыстання, падтрымкі і ўзнаўлення ў гэтым накірунку. У спорце падчас спаборніцтваў абсталяванне і экіпіроўка павінны адпавядаць пэўным патрабаванням.

Тэрмін «спартыўнае абсталяванне» (пад гэтае акрэсленне падпадаюць спартыўнае, гульнявое і рэкрэацыйнае абсталяванне) абазначае сукупнасць усіх інструментаў, якія абслугоўваюць практыку спорту і выкарыстоўваюць у спартыўна арыентаваны вольны час. Яго адрозненне ад звычайнага абсталявання характарызуецца спецыфікай пэўных спартыўных дысцыплінаў. Тэрмін «спартыўная экіпіроўка» выкарыстоўваецца ў адпаведных спартыўных дысцыплінах. Гэтая экіпіроўка ўключае спартыўную вопратку і спартыўны абутак і можа быць разгледжана як неабходная форма (рэквізіт) для заняткаў спортам. Спартыўная экіпіроўка можа быць катэгарыязаваная ў адпаведнасці з наступнымі крытэрыямі: малая ці вялікая экіпіроўка; экіпіроўка, якая разбіраецца на часткі, і апараты, на якіх адбываюцца спаборніцтвы; абсталяванне, якое рухаецца чалавекам; абсталяванне для выкарыстання пад дахам і на паветры.

У адпаведнасці з Ф. Роскамам [8, с. 174–183], у якасці характарыстыкі спартыўнага абсталявання і экіпіроўкі могуць быць адносіны паміж відам спартыўнага абсталявання і экіпіроўкі і планаваннем, як выкарыстаць гэтае абсталяванне і экіпіроўку. Маюцца на ўвазе перш за ўсё такія спецыфічныя аспекты, як награванне, акустыка, магчымасць пашкоджання, гігіенічная сістэма, шматразовасць выкарыстання, штучныя прыстасаванні. Прыкладамі ў дадзеным выпадку выступаюць такія спартыўныя дысцыпліны, як веславанне, веласіпедны спорт, лыжны спорт, тэніс. Ф. Роскам аналізуе тэрмін «спартыўнае абсталяванне» праз уключэнне ў гэтае паняцце ўсіх тых дзеянняў, што адносяцца да планавання запытаў, падрыхтоўкі плану і пабудовы абсталявання для рэкрэацыі, гульні і спартыўнага спаборніцтва. Сюды дадаюцца таксама прыстасаванні для абслугоўвання спартыўнага абсталявання [7, с. 362–369].

У межах правіл заняткаў па рэкрэацыі, гульні і спартыўных спаборніцтваў гэтае абсталяванне з'яўляецца фіксаваным. Яно выкарыстоўваецца на адкрытым паветры, ігральных пляцоўках і спартыўных палях. Яго адметнасць можна ўбачыць у патрэбах для спартыўнай гімнастыкі, воднага пола, для памяшканняў і г.д. Спецыяльнае абсталяванне прадукуецца для пэўных спартыўных дысцыплін, для спартыўных цэнтраў. Асноўная передумова забеспячэння адэкватнага інвентара для людзей, якія цікавяцца спортам у межах правядзення вольнага часу, арыентаванага на здаровы лад жыцця, – аналіз чалавечых запытаў як базавага вызначэння неабходнага рэквізіта. Гэта адносіцца да патрабаванняў гульні ў дашкольным узросце, для школьнага спорту, клубнага спорту (спорт для ўсіх) і спорту вышэйшага ўзроўню, а таксама для рэкрэацыі.

**Заключэнне**

Якасныя змены ў сістэме спартыўнай дзейнасці, якія імкліва сталі адбываліся ў апошнія дваццаць гадоў мінулага стагоддзя, галоўным чынам паўплывалі на легітымізацыю прафесіяналізма, што ў спалучэнні з тэндэнцыяй камерцыялізацыі прымусілі да інтэнсіфікацыі развіцця, функцыянавання і распаўсюджвання шмат якіх фактараў у гэтай галіне. На Алімпійскія гульні сталі дапускаць прафесійных спартсменаў, чаго раней не было. Варта дадаць, што ўсе папярэднія спробы змяніць правіла 26 Алімпійскай хартыі, дзе ўтрымліваўся запіс пра допуск на ўдзел у спаборніцтвах, сутыкаліся з негатыўным успрыманнем з боку вышэйшых уладаў МАК.

Імклівае развіццё новых накірункаў у рэчышчы фармавання сучаснай інфраструктуры спорту мае сваё лагічнае тлумачэнне ў павелічэнні ролі інфармацыйнага забеспячэння на кожным узроўні функцыянавання гэтай грамадскай з'явы. Уплыў інфармацыі пачынае дамінаваць ад пачатковых ступеняў у першасным падыходзе да навучання асноўным элементам фізічных практыкаванняў і гульняў да рэалізацыі галоўных мэтаў і задач на ўзроўні прафесіяналізацыі. Асобна можна гаварыць пра палітыку спорту, ці, больш дакладна, дасягненне розных палітычных мэтаў сродкамі спорту. На прыкладзе розных краін можна прасачыць глабальную тэндэнцыю, што спартыўныя дасягненні падаюцца як узорная і паспяховая практыка дзейнасці дзяржавы ўвогуле. Найлепшыя спартсмены прэзентуюць той сацыяльны лад, чый сцяг яны ўслаўляюць. Прычым спартыўная міграцыя пачала перасягаць усе фармальныя межы, і нацыянальная прыналежнасць паступова губляе свае сутнаснае прызначэнне. Такое становішча знаходзіць свой адбітак і ў сістэме юрыспрудэнцыі, дзе да таго ж у шмат якіх выпадках дамінуе падзел на спартыўны арбітраж і судовае справаводства ў звычайным яго вымярэнні. Гэта можа назірацца тады, калі спартыўныя федэрацыі забараняюць вырашаць спрэчныя пытанні на ўзроўні грамадзянскіх судовых адносінаў. Зрэшты, спартыўнае абсталяванне, інвентар, пабудова спартыўнай інфраструктуры ўсё больш моцна звязваюцца з эканомікай спорту, з усімі тымі дадатковымі дывідэнтамі, якія можна атрымаць ад такога роду спецыфічнай сацыяльнай дзейнасці. Варта яшчэ раз падкрэсліць, што ўсе на-

званыя вышэй напрамкі ні ў якім разе не дзейнічаюць паасобку, яны функцыянуюць і развіваюцца шырэй дзякуючы тым кантактам, якія маюць паміж сабой. Менавіта таму ў працэсе далейшага развіцця і распаўсюджвання спорту як сацыяльнага феномену паўстаюць новыя якасныя формы гэтай узаемнай сувязі, якія ў выніку ствараюць раней невядомыя віды і інварыянты чалавечай жыццёвай дзейнасці.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Люкевіч, У. Спартыўны турызм: ад EURO-2012 да EURO-2016. Футбольныя заўзятары ў святле новых сацыяльных рэаліяў і трэндаў / У. Люкевіч // Географія, економіка і туризм: національний та міжнародний досвід : матеріали юбілейної X Міжнар. наук. конф. – Львів : Львів. нац. ун-т ім. Івана Франка, 2016. – С. 226–231.

2. Bloss, H. Sportökonomie / H. Bloss // Sportwissenschaftliches Lexikon / P. Röthig (red.). – Schorndorf : Hofmann, 1983.

3. Güldenpfennig, S. Politikwissenschaft und Sport – Sportpolitik / S. Güldenpfennig // Theorie- und Themenfelder der Sportwissenschaft / H. Haag, B. G. Strauß, S. Heinze (red.). – Schorndorf : Hofmann, 1989. – S. 138–159.

4. Heinemann, K. Ökonomie des Sports / K. Heinemann // Theorie- und Themenfelder der Sportwissenschaft / H. Haag, B. G. Strauß, S. Heinze (red.). – Schorndorf : Hofmann, 1989. – S. 184–197.

5. Kneyer, W. Informationswissenschaft und Sport – Sportinformation / W. Kneyer // Theorie- und Themenfelder der Sportwissenschaft. – Schorndorf / H. Haag, B. G. Strauß, S. Heinze (red.). – Schorndorf : Hofmann, 1989. – S. 126–137.

6. Reschke, E. Rechtswissenschaft und Sport – Sportrecht / E. Reschke // Theorie- und Themenfelder der Sportwissen-schaft. – Schorndorf / H. Haag, B. G. Strauß, S. Heinze (red.). – Schorndorf : Hofmann, 1989. – S. 160–173.

7. Roskam, F. Sportstätten / F. Roskam // Sportwissenschaftliches Lexikon / P. Röthig (red.). – Schorndorf : Hofmann, 1983. – S. 362–369.

8. Roskam, F. Technik-orientierte Wissenschaften und Sport – Übungsstätten Geräte / F. Roskam // Theorie- und Themenfelder der Sportwissenschaft / H. Haag, B. G. Strauß, S. Heinze (red.). – Schorndorf : Hofmann, 1989. – S. 174–183.

9. Schmitz, N. Sportdokumentation / N. Schmitz // Sportwissenschaftliches Lexikon ; P. Röthig (red.). – Schorndorf : Hofmann, 1983. – S. 108–109.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 05.06.2018

***Lukievich U.P.*** **The Emergence of New Theoretical and Cultural Trends in Sport Studies in the Late Twentieth Century**

*New theoretical and culturological developments in sports research in the late twentieth century were necessarily presented as a result of the intensive development of scientific knowledge, on the one hand, and the rapid penetration of the phenomenon of sport into other spheres of human life activity, on the other. In combination with the dominant scientific directions that existed before, the sports component became an important part of their specific branch. In this case, specific areas were created in sports research, which later influenced the practice of this type of social activity. Sports information, sports policy, sports economics, sports law, new developments in the field of sports equipment and equipment have greatly contributed to the process of developing the sports infrastructure. Mutual contacts between the listed elements have influenced the emergence of qualitatively new facts and factors of sport.*